**на манаграфію *А. У. Сузько***
***«Антычнасць у беларускім кантэксце: антычныя вобразы і матывы ў паэзіі Максіма Танка».*** **–**
**Мазыр : УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2008. – 121 с.**




На сённяшні дзень актуальнай застаецца праблема прачытання беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай, у прыватнасці, асноватворнай для еўрапейскай цывілізацыі старажытнай культуры Антычнасці. Таму манаграфія Алены Уладзіміраўны Сузько мае пэўную навуковую каштоўнасць. Тым больш, што ў ёй прааналізавана рэцэпцыя вобразна-эстэтычнага патэнцыялу Старажытнай Грэцыі і Рыма ў творчасці слыннага майстра беларускага прыгожага пісьменніка Максіма Танка. Як вядома, менавіта гэты аспект танкаўскай творчасці, нягледзячы на шматлікія напрацоўкі айчыннай крытыкі і літаратуразнаўства, найменш вывучаны.

На высокім навуковым узроўні даследавана праблема мастацкага пераўтварэння вобраза Праметэя, арфічнай сімволікі мастацтва, міфалагічных уяўленняў старажытных грэкаў пра жыццё і смерць, вызначана адметнасць трансфармацыі артэфактаў антычнай культуры і абгрунтаваны формы духоўнай прысутнасці творцаў і мысляроў Антычнасці ў паэзіі Максіма Танка.

Неабходна адзначыць, што творчасць Максіма Танка трактуецца ў кантэксце беларускага прыгожага пісьменніка, у прыватнасці, паэзіі М. Багдановіча, У. Жылкі, У. Дубоўкі, У. Караткевіча, Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, а таксама еўрапейскай паэзіі (польскіх паэтаў Чэслава Мілаша, Збігнева Герберта і інш.). Такое прачытанне спрыяе актуалізацыі метадаў параўнальнага літаратуразнаўства, сучаснай кампаратывістыкі. Даследаванне вядзецца не толькі ў ракурсе нацыянальнай мастацкай свядомасці (фальклору, мастацкай літаратуры), але і ў сферы агульнаеўрапейскіх змястоўных фармальных пошукаў. У прыватнасці, паэзіі Максіма Танка трактуецца і ў галіне эстэтыкі і паэтыкі мадэрнізму, паколькі сам творца ў маладосці актыўна цікавіўся знаходкамі еўрапейскай паэзіі ў рэчышчы формы.

Лічу, што манаграфія А. У. Сузько будзе карыснай як для спецыялістаў у галіне айчыннай і еўрапейскай філалогіі, так і для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ, можа быць выкарыстана настаўнікамі-прадметнікамі на ўроках беларускай літаратуры і ў пазакласнай рабоце. Таму відавочнай становіцца патрэба ў публікацыі вынікаў навуковых даследаванняў Сузько А. У.

Рэцэнзент
*А. М. Дарагакупец, кандыдат філалагічных навук,*
*загадчык кабінета беларускай філалогіі філалагічнага факультэта БДУ*

МГПУ им. И.П.Шамякина